# *§ 43–44–0. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVII — XVIII ст.

**1. Роля Беларусі ў еўрапейскай эканоміцы.** Эканоміка Беларусі ў XVI–XVIII стст. грунтавалася на сельскагаспадарчай вытворчасці і гандлі, хоць у гарадах дзейнічала мноства рамесніцкіх майстэрняў, а напачатку XVIII ст. з'явіліся першыя мануфактуры. Беларускія землі адыгралі важную ролю ў забеспячэнні Заходняй Еўропы збожжам (жытам), шкурамі буйной рагатай жывёлы, футрам, драўнінай, ільном, попелам (калійная соль — паташ), смоламі (дзёгаць). Збожжавыя, прадукцыя жывёлагадоўлі і футра складалі амаль 90 % экспарту на еўрапейскія рынкі ў XVI ст. У сваю чаргу, купцы («госці») прывозілі для магнатаў, шляхты, заможных мяшчан, вярхоў духавенства віно, піва, садавіну, экзатычныя спецыі, прадметы раскошы, мэблю, дарагія тканіны. Вялікім попытам карысталася соль, а таксама мануфактурныя вырабы, у тым ліку галантарэйныя тавары і каляровыя металы.

Успомніце, дзе і калі паўсталі першыя мануфактуры ў Беларусі.

Уладальнікі фальваркаў звычайна заключалі кантракты з гандлярамі з горада Гданьска, якія кантралявалі 80 % унутранага гандлю Рэчы Паспалітай, на адпраўку збожжа ў гэты марскі порт на Балтыйскім моры. Для дастаўкі сельскагаспадарчай і лесапрамысловай прадукцыі выкарыстоўвалі суднаходныя рэкі, напрыклад Нёман, Буг, Заходнюю Дзвіну. Рэкі ўяўлялі сабой адносна развітую інфраструктуру з рачнымі партамі і збожжасховішчамі. З Гданьска марскія судны перавозілі грузы ў буйны́я еўрапейскія гарады, такія як Антверпен і Амстэрдам.

Таксама варта адзначыць ролю паташу ў міжнародным гандлі. Паводле ацэнак гісторыкаў, пачынаючы з XVII ст. еўрапейскі імпарт калійнай солі

складаў больш за 6 млн м$^3$ штогод. У перыяд з 1420 да 1620 г. асноўнымі экспарцёрамі паташу, які атрымоўвалі з драўніны, былі Гданьск, Кёнігсберг, Рыга. Асноўным спажыўцом попелу да канца XV ст. быў Лондан, які з'яўляўся цэнтрам вытворчасці мяккага мыла, а ў XVI ст. еўрапейскі гандаль паташом пачалі кантраляваць галандцы.

Аднак роля гандлю збожжам і паташом падупала напрыканцы XVII ст. Гандлёвыя адносіны былі парушаны шматлікімі войнамі, а шляхціцы не шукалі новых метадаў гаспадарання, захоўваючы нязменнай фальваркава-паншчынную сістэму. Так званае «экспартнае прыгонніцтва» працягвала функцыянаваць, а становішча залежных сялян пагаршалася з прычыны росту паншчыны і іншых феадальных павіннасцей. Цэнтры экспарту паташу перамясціліся з Прыбалтыкі ў Белае мора, у расійскі порт Архангельск. У 1700 г. пераважаў ужо «рускі попел», хоць Гданьск па-ранейшаму славіўся якасцю сваёй калійнай солі.

Як вы разумееце выраз «экспартнае прыгонніцтва»?

XVIII стагоддзе ў еўрапейскай гісторыі называюць «стагодзем гандлю». Актыўна развіваўся як унутраны, так і знешні абмен таварамі і сыравінай, які прадугледжваў шырокае выкарыстанне грошай. Еўропа заняла пануючае становішча ва ўсім свеце — насельніцтва няспынна павялічвалася, эканоміка расла, капіталізм усё больш пашыраўся ў краінах, сельская гаспадарка квітнела, развіваліся гандлёвыя стасункі з іншымі кантынентамі. Гандаль у XVIII ст. набыў міжнародны характар дзякуючы еўрапейскаму падзелу працы. З Усходняй Еўропы па-ранейшаму вывозілі ў асноўным збожжавыя культуры, лес, паташ, лён.

Да сярэдзіны XVIII ст. беларускія землі знаходзіліся ў гаспадарчым заняпадзе ў выніку шматлікіх унутраных і знешніх войнаў. Так, у 1700–1719 гг. Рэч Паспалітая штогод вывозіла каля 20 тыс. лаштаў збожжа (прыблізна 40 тыс. тон).

Экспарт рамесніцкіх вырабаў скараціўся наогул. За прадукцыю, якую вывозіла, краіна штогод атрымлівала 35 млн злотых, а за тавары, якія ўвозіла, плаціла 40 млн злотых. З іх 18 млн складалі спецыі і прадметы раскошы, 15 млн — віно. Толькі напрыканцы XVIII ст. сітуацыя ў знешнім гандлі стабілізавалася. Толькі праз Гданьск вывозілі ў сярэднім 170 тыс. лаштаў збожжа.

Пасля заканчэння будаўніцтва Агінскага канала, што злучыў басейны Нёмана і Дняпра, Прусія ўвяла высокія мыты на тавары, што перавозіліся Віслай да Гданьска. Зрабілася нявыгадна вывозіць збожжа праз Гданьск. Таму галоўным портам робіцца Кёнігсберг. Перавозіць і сплаўляць туды прадукцыю з беларускіх зямель выходзіла танней. З Гродна, Мінска, Вільні везлі збожжа, паташ, каноплі, лён, дзёгаць, ільняное семя, палотны і футры. У Кёнігсбергу купцы набывалі соль, так званыя «каланіяльныя тавары», англійскія віны, галандскія тканіны, вапну і жалеза. Гарады Шклоў, Віцебск, Полацк, Орша везлі грузы як у Кёнігсберг, так і ў Рыгу (Заходняй Дзвіной).

Што значыць «каланіяльныя тавары»? Даведайцеся, якія з іх карысталіся попытам на тэрыторыі Беларусі.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Уявіце, што вы — пачынаючы журналіст, якому даручылі напісаць артыкул для гістарычнага часопіса. Ваша задача — сабраць цікавыя факты пра Агінскі канал, адно з найважнейшых гідратэхнічных збудаванняў Беларусі XVIII стагоддзя (гісторыя будаўніцтва, роля ў эканоміцы рэгіёна, культурнае значэнне, сучасны стан). Артыкул павінен зацікавіць гледача і паказаць значнасць канала ў гісторыі і культуры краіны.




Падрыхтуйцеся прадставіць свой артыкул перад класам, расказаўшы, якія факты вас асабліва ўразілі і чаму вы абралі менавіта гэтыя звесткі.

Пастпова актыўную ролю ў балтыйскім гандлі пачала адыгрываць Расія. У другой палове XVIII ст. яе знешнегандлёвае абарачэнне павялічылася ў 7 разоў. З Расіі вывозілі пяньку, жалеза, льняныя тканіны, выраблены скуры, лес. У канцы стагоддзя атрымаў развіццё міжнародны гандаль праз паўднёвыя чарнаморскія парты — Керч, Феадосію, Севастопаль. Гаспадарка Беларусі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай усё шчыльней звязвалася з усерасійскім рынкам..

1. Складзіце тэзісны план адказу на тэму «Роля Беларусі ў еўрапейскай эканоміцы ў XVI–XVIII стст.».
2. Што, на ваш погляд, паспрыяла эканамічнаму развіццю Беларусі ў XVI–XVIII стст., што было фактарам, які стрымліваў?